Ідзі і глядзі

# ВЯЛІКІЯ ЛЯЛЬКІ І ІХ СПАДЗЯВАННІ

**Беларуская батлейка ля ўваходу ў глядзельную залу, вясёлыя лялькі, якія частуюць гасцей хлебам, дзеці і дарослыя, якія чакаюць самага галоўнага адкрыцця для сябе — адкрыцця мастацтва… Прыкметы Беларускага міжнароднага фестывалю тэатраў лялек, які пачаўся ўчора — пра гэта гучна пратрубілі музыкі ансамбля «Гуды» Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў, запрасіўшы ўсіх у залу, дзе пачаткам павінен быў стаць спектакль гаспадароў. Але прэм'еру «Балады пра белую вішню» прыйдзецца яшчэ пачакаць, а ў рамках фестывалю быў паказаны іншы спектакль мінскіх лялечнікаў. І дзіўныя гадзіннікі розных формаў ля сцэны пачалі адлік чароўных імгненняў самага незвычайнага фестывалю, у праграме якога спалучыліся прыгожыя спектаклі для дзяцей і сур'ёзныя пастаноўкі для дарослых, якія прыехалі з розных куткоў Еўропы. І ў нас ёсць толькі шэсць дзён на тое, каб паглядзець 21 пастаноўку з якіх 6 пакажуць беларускія тэатры.**

***Уладзімір РЫЛАТКА, першы намеснік міністра культуры Беларусі:***

— Гэта вялікае свята для нашага горада, якое нічым замяніць немагчыма. Амаль што дзесяць гадоў фестываль не праводзіўся, але прыкметна, што ён вяртаецца ў юбілейны год для Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек. Яму рады не толькі мы, але і нашы госці — да нас прыехалі лепшыя тэатры свету. Сёння можна сказаць: самаму лепшаму нашаму фестывалю — быць!

***Аляксандр КУЛЕШ, госць з Рускага інжынернага тэатра, Санкт-Пецярбург:***

— Я рады, што мы прыехалі ў Беларусь. У нас ёсць школа, якая рыхтуе лялечнікаў, і вы зможаце ацаніць яе вартасці. Фестываль — выдатная магчымасць паказаць сваё майстэрства. Але любы фестываль — гэта мір, дзе няма геаграфічных межаў, гэта асаблівая краіна, дзе пануе дабрыня.

***Яўген ЛЕМАКОЎ, дырэктар Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек:***

— Усе, хто займаецца тэатрам лялек, ведаюць, што значыць падрыхтаваць фестываль, што значыць сустрэць гасцей. Да нас прыехалі ўсе, каго мы чакалі. Квіткоў на спектаклі ўжо няма і ў гэтым ёсць вялікая радасць. Кіраўніцтва горада прыклала намаганні, каб фестываль адбыўся. Жадаю прыемных уражанняў гледачам ад спектакляў, а гасцям ад нашага горада.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ